**ВОДЗЫЎ**

на аўтарэферат дысертацыі Шындлер Эліны Генадзьеўны

«Пластычны фальклор і фальклaрызм

у сучасным народным мастацтве Беларусі»,

прадстаўленай на суісканне вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства

па спецыяльнасці 17.00.04 –

выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура

Дысертацыя Э. Г. Шындлер «Пластычны фальклор і фальклaрызм у сучасным народным мастацтве Беларусі» выклікае значную цікавасць спецыялістаў, якія займаюцца даследаваннем працэсаў фальклaрызацыі сучаснага народнага мастацтва. Выбраная аўтарам тэма асабліва актуальная ў сувязі з пастаянным ростам вырабаў у стылістыцы народных традыцый і іх разнастайнасцю. Такая разнастайнасць хаця і спрыяе развіццю сучасных напрамкаў традыцыйнай мастацкай творчасці, але ўтойвае небяспеку размывання межаў паняцця «народнае мастацтва» і падмены традыцыйнай аўтэнтычнай пластыкі мастацкімі інтэрпрэтацыямі «па матывах» народных традыцый, якія часта маюць аддаленае дачыненне ці толькі знешняе падабенства да традыцыйнай мастацкай спадчыны.

Даследаванне, у тым ліку, выяўляе прычыны трансфармацыі мастацкай формы ў сучасным народным мастацтве, сярод якіх – змена культурнага кантэксту ў грамадстве, прыход прафесійных мастакоў у сферу народнага мастацтва, з’яўленне новых тэхнічных сродкаў, якія замянілі ручную працу.

Пастаўленыя аўтарам задачы – абгрунтаваць неабходнасць увядзення ў навуковы ўжытак тэрмінаў «пластычны фальклор», «пластычны фальклaрызм» і мэтазгоднасць іх выкарыстання ў галіне народнага мастацтва, выявіць адзнакі пластычнага фальклору ў гістарычнай дынаміцы іх узнікнення і развіцця ў ручным ткацтве, ганчарстве, саломапляценні, вызначыць і сістэматызаваць найбольш характэрныя для беларускага народнага мастацтва праявы пластычнага фальклaрызму, выявіць адзнакі пластычнага фальклору і ступень фальклaрызаванасці сучаснага народнага мастацтва – вырашаны ў поўным аб'ёме і выразна адлюстраваны ў заключэнні.

Э. Г. Шындлер сабрала, вывучыла і сістэматызавала вялікі аб'ём факталагічнага матэрыялу, што дазволіла ёй правесці грунтоўны аналіз вырабаў традыцыйнага мастацтва, размежаваць адзнакі пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклaрызму і вызначыць ступень фальклaрызаванасці сучаснай народнай творчасці. Вынікі аналітычнага даследавання з’яўляюцца каштоўным матэрыялам для вырашэння навуковых, мастацкіх і навучальных задач спецыялістамі навуковых, мастацкіх і адукацыйных устаноў.

Матэрыялы дысертацыі будуць спрыяць павышэнню ўзроўня мастацкай творчасці майстроў сістэмы народных рамёстваў і мастацкіх промыслаў. Алгарытм вызначэння адзнак пластычнага фальклору і праяў пластычнага фальклaрызму будзе карысным для спецыялістаў, занятых у галіне адраджэння і захавання традыцыйнай спадчыны.

Практычная значнасць дысертацыі заключаецца ў магчымасці выкарыстання аналітычнага матэрыяла і вынікаў даследавання для распрацоўкі навучальных праграм,

метадычных дапаможнікаў, праграм семінараў, лекцый па праблемах сучаснага народнага мастацтва для сістэмы сярэдняй і вышэйшай прафесійнай адукацыі, перападрыхтоўкі кадраў і павышэння кваліфікацыі спецыялістамі.

Вынікі даследавання даюць магчымасць сцвярджаць, што дысертацыя Э. Г. Шындлер «Пластычны фальклор і фалькларызм у сучасным народным мастацтве Беларусі» з'яўляецца самастойнай навуковай работай, аўтар якой заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата мастацтвазнаўства па спецыяльнасці 17.00.04 – выяўленчае і дэкаратыўна-прыкладное мастацтва і архітэктура.

Выказваю згоду на размяшчэнне водзыву на сайце ДНУ «Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Беларусі».

Дэкан факультэт навуковай, давузаўскай
падрыхтоўкі і дадатковай адукацыі
установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная
акадэмія мастацтваў»,
кандыдат мастацтвазнаўства А. Я. Шыфрын

«23» мая 2024 г.

ПОДПІС СВЕДЧУ
Спецыяліст па кадрах аддзела кадраў
А.С.Мелюк
23.05.2024

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ «БЕЛАРУСКАЯ ДЗЯРЖАЎНАЯ АКАДЭМІЯ...» АДДЗЕЛ КАДРАЎ